Том 12 • 2012 ACTA ALBARUTHENICA ISSN 1898-8091

**Ірына Бурдзялёва**
Мінск

# Правакацыйныя стратэгіі ў паэзіі Янкі Купалы

Янка Купала ў сваёй паэтычнай творчасці выявіўся ў шматлікіх іпастасях: як пясняр сялянскай нядолі і філосаф-асветнік, як тонкі лірык і адраджэнец-будзіцель, і, урэшце, як нацыянальны прарок-месія. У кожным сваім паэтычным абліччы ён выкарыстоўвае адмысловыя аўтарскія прыёмы ўздзеяння на чытача.

Паэт прыйшоў у беларускую літаратуру на ўжо падрыхтаваную глебу, быў абуджаны да беларускамоўнай творчасці кнігамі В. Дунін-Марцінкевіча і Ф. Багушэвіча. Але ў дыялектычным працэсе літаратурнага развіцця паэзія Янкі Купалы ад самага пачатку выглядала палемічнай у адносінах да папярэдняй паэтычнай традыцыі і ўстойлівага іміджу мужыка. Паэт адчуваў вострую праблему тагачаснай беларускай літаратуры – адсутнасць актыўнага героя, так неабходнага для выхаду нацыі на новы гістарычны ўзровень. У імклівым працэсе нацыянальнага адраджэння паўстала першачарговая задача фарміравання асобы ў чалавеку, абуджэння пачуцця асабістай годнасці асуджанага на небыццё народа. Невыпадкова вядомы артыкул В. Ластоўскага *Сплачвайце доўг*, у якім аўтар наракаў на слёзны тон нашай літаратуры, згушчэнне змрочных фарбаў, сцвярджэнне наканаванасці на гора і пакуты ўласнага народа, выклікаў ажыўленую дыскусію сярод беларускіх пісьменнікаў. І хаця Янка Купала як удзельнік літаратурнай палемікі надрукаваў *Чаму плача песня наша*? (*адказ Юрцы Верашчаку*), ён не супярэчыў асноўным тэзам В. Ластоўскага. Паэт хутчэй тлумачыў прычыну тужлівага тону беларускай літаратуры і абнадзейваў: „Але яна вечна такой не будзе, як і народ жывы вечна не будзе спаць мёртвым сном”[1]. Побач з традыцыйным вобразам працавітага, сумленнага селяніна-пакутніка, мужыка-цярплівца павінен быў паўстаць новы тып героя – актыўнага, духоўна спелага, нацыянальна свядомага.

У варунках паскораных працэсаў нацыябудаўніцтва патрэбны былі новыя і дастаткова актыўныя літаратурныя сродкі, сапраўды дзейсныя аўтарскія прыёмы перайначвання ранейшых канвенцыянальных норм і ўстойлівых сацыяльна-псіхалагічных штампаў. Такімі эфектыўнымі сродкамі ўздзеяння на чытача, пакліканымі мяняць сацыяльныя, культурныя і асобасныя стэрэатыпы і такім чынам спрыяць змяненню і абнаўленню чалавека і грамадства, былі рознага кшталту правакацыйныя стратэгіі.

Варта адразу ўдакладніць, што не маецца на ўвазе найбольш распаўсюджаная негатыўная трактоўка слова „правакацыя”. Сапраўды, звычайна правакацыя асацыіруецца з канфліктам, падбухторваннем, падманам, здрадай, шокам і іншымі

[1] Я. К у п а л а, *Поўны збор твораў у 9 тамах*, т. 8, *Артыкулы, нататкі, выступленні, калектыўныя творы*, Мінск 2002, с. 28.

адмоўнымі з'явамі. Прынамсі з такім значэннем гэта слова падаецца ў тлумачальных слоўніках. Але сучасныя навукі, арыентаваныя на непасрэдныя стасункі з людзьмі, – культуралогія, сацыялогія, псіхатэрапія, педагогіка і інш., – пад правакацыяй бачаць заклік, заахвочванне, матывацыю да зменаў і інтэрпрэтуюць яе як спецыфічны прыём стымулявання станоўчых працэсаў у чалавеку і соцыуме. Расійская даследчыца Е. Марозава піша:

> „Правакацыйнасць у гэтым выпадку разглядаецца ў якасці сродку псіхалагічнага ўздзеяння, які выконвае функцыю каталізатара пазітыўнага развіцця партнёра па ўзаемадзеянню"[2].

Яна падкрэслівае акмеалагічны аспект правакацыйнасці, яе вялікі патэнцыял у дасягненні чалавекам найбольшай ступені свайго развіцця.

Культуролагі і мастацтвазнаўцы называюць правакацыю вядучай стратэгіяй сучаснага авангарднага мастацтва, а само паняцце мастацкай правакацыі стала прыжылося ў слоўніках постмадэрнізму. Але ўніверсальны характар правакацыі відавочны. У шырокім сэнсе правакацыйнасць разглядаецца як адзін з даўніх метадаў вырашэння складаных праблем кіравання станаўленнем асобы і соцыуму, як базавы сацыяльна-псіхалагічны механізм развіцця культуры і літаратуры.

Аўтарскія прыёмы псіхалагічнага ўплыву на чытача ў Янкі Купалы вельмі разнастайныя. З аднаго боку ён сцвярджае веру ў крэатыўныя мажлівасці свайго чытача, а таксама імкнецца ўмацаваць яго ўпэўненасць ва ўласную пераствaральную моц:

„Ў сэрцах нашых жар не згас –
Бухне ў свет калісь яскрава,
Бо наперадзе йшчэ ў нас
Барацьба, жыццё і слава!"[3]

Але часам паэт не імкнецца патрапіць свайму чытачу, быць сугучным яго настроям і псіхалагічным устаноўкам масавай чытацкай аўдыторыі. Найчасцей як паэт-рамантык Янка Купала знарок дыстанцыруецца ад свайго чытача, свядома супярэчыць яму, выступае ў адносінах да яго не pro-, а contra-. Дзеля дасягнення большага эфекту паэт выкарыстоўвае разнастайныя правакацыйныя прыёмы, якія выглядаюць дастаткова некамфортнымі для чытача, але тым не менш менавіта яны могуць зачапіць, пахіснуць унутраны спакой і раўнавагу, давесці да абурэння, псіхалагічнай фрустрацыі і такім чынам абудзіць, садзейнічаць унутранаму пераpаджэнню і фарміраванню новых каштоўнасных установак.

Правакацыйнасць як стратэгія псіхалагічнага ўздзеяння выяўлена ў паэзіі Я. Купалы праз канкрэтныя мастацкія прыёмы. Ужо на пачатку творчасці пісьменнік падманвае звыклыя чаканні чытача. Беларуская літаратура пачатку мінулага стагоддзя прызвычаілася ў асноўным скардзіцца або па-філасофску разважаць разам з мужыком, і выражалася гэта найперш у эмацыянальна-рэфлексійным супрацьстаянні рэчаіснасці. Ужо першы беларускамоўны друкаваны верш Янкі Купалы *Мужык* утрымліваў у сабе дастаткова нечаканы для чытача паварот у прывычным

[2] Е. М о р о з о в а, *Провокативность как метод социально-психологического воздействия* (*на примере авангардного искусства*) [online], http://rubtsov.penza.com.ru/chitar/7/morozova.htm [доступ: 12.08.2012].

[3] Я. К у п а л а, *Поўны збор...*, т. 3, *Вершы, пераклады 1911–1914*, Мінск 1997, с. 173.

сялянскім маналогу. Пачатак твора вытрыманы ў танальнасці скаргі, якая паступова насычаецца гнеўнай іроніяй. Скіраванасць да багушэвічаўскай традыцыі падкрэсліваецца рэфрэнам, сугучным вершу Ф. Багушэвіча *Дурны мужык, як варона*. Калі чытач ужо прызвычаіўся да манатоннага нанізвання ўсё новых і новых скаргаў селяніна, паэт, ламаючы стэрэатыпную функцыю героя-мужыка, пераводзіць яго гаворку ў новы рэгістр. Апошнія дзве страфы гучаць палемічна да папярэдніх радкоў верша, нечакана – як парушэнне традыцыйных, звыклых норм паводзін мужыка на старонках мастацкага твора. Гэты мужык Янкі Купалы становіцца актыўным, жыццесцвярджальным, надзеленым рысамі моцнай асобы.

Паэт адчувае неабходнасць паказаць чытачу новыя ўзоры паводзін, памяняць устойлівае ўспрыняцце селяніна адно як цярплíўца і гаротніка, адлучанага ад вырашэння як асабістага лёсу, так і надзённых праблем рэчаіснасці. Насычаным новымі для чытача настроямі выглядае і эпіграф да зборніка *Жалейка*. Пачатак яго дастаткова традыцыйны: „Грай, мая жалейка, // Пей, як салавейка! // Апявай нядолю, апявай няволю...”[4]. Апошнія радкі эпіграфа – „І грымні свабодна, // Што жыве край родны!” – гучалі па-новаму заклікальна, і пэўным чынам кантраставалі са стэрэатыпам паводзін героя Ф. Багушэвіча, Мацея Бурачка, удумлівага філосафа, праўдашукальніка, які тым не менш не спяшаўся голасна агучваць сваю праўду і крычаць аб ёй на ўвесь свет. Актыўны і свабодалюбівы селянін-беларус, які паўставаў у вершах Янкі Купалы, больш быў рамантычнай марай самога паэта пра правільнага, запатрабаванага новым часам мужыка. Ён выглядае рамантычным узорам той новай асобы, у якую павінен пераўтварыцца сапраўдны беларускі селянін – Мацей Бурачок, які сваёй псіхалогіяй і паводзінамі больш адпавядаў рэальнасці. Мастацкі прыём Янкі Купалы, звязаны з падманам звыклых чаканняў чытача, парушэннем яго ранейшых псіхалагічных установак, накіраваны на перайначванне інтраверта-беларуса як аб’екта гісторыі ў суб’ект гістарычнага развіцця, спрыяе пераўтварэнню праўдашукальніка ў барацьбіта.

Усеабдымная адраджэнская інтэнцыя ў беларускай сацыякультурнай прасторы вымагала, каб да апетай Ф. Багушэвічам працавітасці, сумленнасці, удумлівасці беларуса дадалася актыўная грамадзянская пазіцыя, адказнасць за лёс свайго краю, выспелае пачуццё нацыянальнай годнасці. Непрадказальна-нечакана выглядаюць апошнія радкі купалаўскага верша *Гэта крык, што жыве Беларусь*. Яны завяршаюць замілаваны агляд героем сваёй хаткі „з саламянай страхой”, „зялёненькага саду”, у якім ад прыгажосці „захліпаецца дух”, поля за вёскай, уласнай зямелькі, што „зелянее з аўсом”. Усё гэта блізкае і суразмернае па маштабах селяніну, які першапачаткова асацыіруе „родненькі край” вельмі канкрэтна з тым, што непасрэдна атачае яго. Апошнія два радкі: „А што часам тут страшна заенча віхор, – // Гэта енк, гэта крык, што жыве Беларусь!”[5] – перапыняюць апісальнасць верша, перакрэсліваюць камернасць і бытавізм вобразаў, кладуць канец ціхамірнасці і спакою. Адбываецца прарыў у іншае вымярэнне – маштабнае, абагульняючае, звязанае са сцвярджэннем жыццетрываласці ўсёй „маткі-зямлі” Беларусі.

Як адметную рысу паэзіі Янкі Купалы навукоўцы адзначаюць незвычайную сугестыўнасць. П. Васючэнка трапна падкрэслівае спецыфіку купалаўскай сугестыі,

[4] Я. К у п а л а, *Поўны збор...*, т. 1, *Вершы, пераклады 1904–1907*, Мінск 1995, с. 170.
[5] *Ibidem*, с. 194.

> „у аснову якой пакладзена не імкненне «зацямніць» з'явы, а наадварот, «прасвятліць» іх, адолець магічную наканаванасць рэчаў, у імя паэтычнага ідэалу, нацыянальнай ідэі"[6].

Правакацыйныя прыёмы служаць узмацненню сугестыўнага ўздзеяння, больш яркаму „прасвятленню" праблемных з'яў, і такім чынам стымулююць працэс абнаўлення сацыяльных, культурных і асобасных стэрэатыпаў, спрыяюць змяненню чалавека і грамадства. Сярод найбольш ўжываных паэтам правакацыйных прыёмаў, апрача разгледжанага вышэй падману звыклых чаканняў чытачоў, можна назваць парадаксальнасць, спалучэнне неспалучальнага, крайнюю кантраснасць, трагічную іронію.

Правакацыйная сітуацыя можа ствараецца Янкам Купалам пры выкарыстанні прыёмаў адмаўлення, напрыклад, у вершы *Я не паэта*. Часам для дасягнення патрэбнага эфекту паэт далучае трагічную іронію. У вершы *На рынку* прадаецца „Маленькая рэч, – як матыль і стрынатка… // Ўсёй куплі – душа беларуса". Эпатажна заяўляецца, што і трыццаць срэбнікаў за яе замнога, бо зараз „станела ўсё – душы і цуды". Паэт як быццам звяртаецца да суседзяў, якія ўсё нашае дабро „прыйшлі і забралі", і толькі душа яшчэ засталася: „Бо так – не купіўшы – не след на крыж весці: // Гатовы сказаць, што вы ўкралі…"[7]. Але найперш твор, безумоўна, адрасаваны самім беларусам, а псіхалагічная рэакцыя ад праціўнага павінна ўздзейнічаць на пачуццё чалавечага і нацыянальнага гонару. Змадэляваны правакацыйны сюжэт, правакацыйныя заклікі і прапановы паэта выступаюць як каталізатар развіцця станоўчых працэсаў, як сродак пераадолення праблемнай сітуацыі.

Трагічнай іроніяй прасякнуты верш *А ты, браце, спі*, скіраваны на абуджэнне грамадскай актыўнасці селяніна, на кардынальнае перайначванне яго старых ролевых функцый. Словы – „Няхай тыя уставаюць // Рана да зары, // Што свабодачку кахаюць! – // А ты, браце, спі!.." – кантрастуюць з пачаткам верша, дзе апісана ўсеагульнае абуджэнне: „Вясна. Сонца узыходзе, // Свеце на зямлі; // Дух збудзіўся у народзе,– // Усталі, пайшлі"[8]. Правакацыйны заклік з боку аўтара – „А ты, браце, спі" – мае на ўвазе адваротны псіхалагічны вынік, змену звыкла абыякавых адносін на супрацьлеглыя, імкненне абудзіць адказнасць за матэрыяльна-побытавую і духоўную сферы жыцця.

Падобныя правакацыйныя стратэгіі задзейнічаны Янкам Купалам і ў вершы *Гэй, капайце, далакопы*…. Верш прасякнуты заклікальнымі інтанацыямі, напоўнены падкрэслена ўрачыстымі вобразамі. Тут і званы „з усіх вежаў", якія павінны біць у набат. Тут і зварот да „слаўных музыкаў" – „зайграйце ў мільёны струнаў". Тут і запрашэнне да сыноў і дачок справіць гучную бяседу. Мэта ўсеагульнага ўзрушэння пазначана паэтам выразна правакацыйна-эпатажна: „Хаўтуры ўжо свае будзе // Беларусь спраўляці"[9]. Паэт кідае выклік устойліваму самаізаляванню народа ад удзелу ў вызначэнні гістарычных перспектыў уласнай зямлі. Парадаксальнасць сюжэтаў і вобразных спалучэнняў падкрэслівае вастрыню сітуацыі і скіравана на адкрытую эмацыянальную рэакцыю чытача, якая патэнцыяльна можа прывесці да ўнутраных пераменаў.

---

[6] П.В. Васючэнка, *Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм. Манаграфія*, Мінск 2004, с. 105.

[7] Я. Купала, *Поўны збор*..., т. 2, *Вершы, пераклады 1908–1910*, Мінск 1996, с. 63.

[8] Я. Купала, *Поўны збор*..., т. 1, *op. cit.*, с. 207.

[9] Я. Купала, *Поўны збор*..., т. 2, *op. cit.*, с. 126.

Эфектыўнае ўздзеянне на чытача дасягаецца Янкам Купалам праз мадэляванне парадаксальнай, абсурднай сітуацыі, спалучэннем кантрастных па семантыцы вобразаў. У паэме *На Куццю* жывыя людзі паводзяць сябе як нябожчыкі, спавітыя „магільным сном”, а духі, прывіды наадварот надзелены вітальнай энергіяй. У вершы *Паязджане* аптымістычны і жыццесцвярджальны матыў вяселля, якое можна было б успрыняць як апафеоз жыцця і светлых сіл кахання, сімвалічна патлумачыць як яднанне нацыі, тут спалучаны з кантрастнымі вобразамі смерці, нерухомасці, духоўнага здранцвення. Удзельнікі заклятага вясельнага поезду пераўтвараюцца ў замбіраваных істот, у пазбаўленых жывой душы нябожчыкаў. Спалучэнне кантрастных матываў свята/жабрацтва ляжыць у аснове верша *Валачобнікі*. Паэт правакацыйна збліжае ўрачысты настрой Вялікадня з матывам жабрацтва, папрашайніцтва, цёмнай ночы, пад час якой, выпрошваючы долі, ходзяць ад двара да двара беларусы-валачобнікі:

„Ніхто, нідзе не чэз такой жывінай,
Як чэзнеш ты, няшчасны беларусе,
У валачобнікі запісаны судзьбінай…
Штогод ты ходзіш дабравольным жабраком
І рабства вечнае ўхваляеш пад вакном…”[10].

У многіх вершах Янкі Купалы праводзіцца скразны матыў заганнага кола, па якім спрадвеку рухаюцца беларусы. Паказальныя назвы вершаў: *За годам год*, *З дня ў дзень*, *Вясна за вясной*. У вершы *Не для нас* ён піша: „З дня на дзень, з году ў год, як пакутнікі, // Б’емся, гінем і шчасця не бачым…”. У вершы *Новы год* з сумам прагназуе: „У той самай цьме, у тым самым кругу, // Як шоў Стары, і Новы йдзе”. У адрозненне ад твораў Якуба Коласа, дзе цыклічны характар чалавечага жыцця быў паказчыкам натуральнасці, стабільнасці і меў пазітыўную афарбоўку, Янка Купала тлумачыць сітуацыю, калі людзі „топчуць усё той след”, сведчаннем унутранай згоды і гатоўнасці народа на пакуты і гістарычную несправядлівасць, праявай абыякавасці і фатальнай бяздзейнасці нават у пераломных сітуацыях. У вершы *Крыўда* ён зноў і зноў паўтарае дакор-папрок у паралюшы волі, у татальнай грамадскай апатыі:

„Не ускалыхне жыцця віхура,
Не завагніць святла над цьмою,
Усё маўчыць, як ноч, панура,
Як пушча дзікая зімою
Ані канца таму пракляццю,
Ані яснотаў тых пачатку…”[11].

Разам з тым праз згушчэнне фарбаў падспудна акрэсліваецца неабходнасць разамкнуць кола, выйсці на новы гістарычны прасцяг. Правакацыйныя стратэгіі з’яўляюцца для Янкі Купалы дзейснымі літаратурнымі спосабамі абуджэння „прыспаных сіл” беларусаў. Выкарыстоўваючы гэтыя прыёмы ў якасці сацыяльна-псіхалагічнага метаду ўздзеяння паэт стымулюе чытача-рэцыпіента да парушэння здаўна прынятых псіхалагічных штампаў і стэрэатыпаў мыслення, да змены статусу пасіўнага назіральніка.

[10] Я. К у п а л а, *Поўны збор*..., т. 3, *op. cit.*, с. 201.
[11] *Ibidem*, с. 219.

Эмацыянальны стан Янкі Купалы ніколі не бывае ў раўнавазе, маятнік эмоцый гойдаецца ў душы паэта ад прасветленай веры і аптымізму да крайняга негатыву і песімізму. Побач з надзеяй у стваральныя сілы народа, апяваннем яго слаўнай мінуўшчыны, якая выступае зарукай шчаснай будучыні, паэт з болем адзначае і вялікія праблемы духоўнай недасканаласці, духоўнага рабства. З аднаго боку, у вершы *З кутка жаданняў* Янка Купала выказвае надзею, „Што не загубяць крыўды жывую // Душу народу, што ўстане са сну…”[12]. Але ў блізкім па часе напісання творы *Пад крыжам* паэт, балюча перажываючы духоўную абыякавасць і інертнасць беларуса, даводзіць негатыў да крайнасці, увасабляе свае перажыванні ў змрочных вобразах-сімвалах:

„Бяссільна народ свой пытаю,
Абняўшы пахілены крыж:
– За што ты ад краю да краю
Магілай жывою ляжыш?”[13]

Правакаванне чытача дасягаецца Янкам Купалам праз рамантычны максімалізм, калі негатыў канцэнтруецца да немагчымага, неверагоднага. Паэт звяртаецца да ўласнага народа са словамі: „вам – пакорным рабам” (*Вясна за вясною*), „прыдаўлены народ” (*Памяці С. Палуяна*), „цені з таго свету” (*Як цені*), „рабскія натуры”, „збэшчаныя госці” (*Прарок*). Гэтыя правакацыйныя звароты павінны выклікаць у чытача эмацыянальную рэакцыю абурэння, нязгоды і такім чынам вывесці яго з духоўнага летаргічнага сну і апатыі, узварушыць стоены духоўны патэнцыял нацыі. Такія ж пачуцці адмаўлення павінны нарадзіць намаляваныя карціны бесперспектыўнасці, бездухоўнасці і абсурднасці чалавечага існавання ў вершы *У ночным царстве*:

„Скрыпяць трухляцінай асіны,
Над курганамі звяр’ё вые…
Гасцінцам, церневай пуцінай,
У ёрмах, скованы, скацінай
Ідуць нябожчыкі жывыя”[14].

Бяздзейнасць і інертнасць беларускай вёскі, абумоўленыя стагоддзямі адчужанасці народа ад самастойнага палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага жыцця, выклікала балючыя перажыванні сваім несупадзеннем з дамінуючай ідэяй „нашаніўскага” Адраджэння – духоўна-нацыянальным вызваленнем народа. У рэчышчы вырашэння гэтай задачы палягае адзін з праграмных вершаў Янкі Купалы *Прарок*. Дзеля таго, каб больш ярка абазначыць сітуацыю ўсеагульнага духоўнага сну-летаргіі і тым самым больш востра акрэсліць праблему для чытача, Янка Купала полюсна разводзіць пазіцыі грамады і прарока, пракладаючы паміж імі мяжу фатальнага ўзаеманепаразумення. Паэт у змрочных танах апісвае жыццё людзей, якія жылі „як непатрэбшчына якая”, і спавіты цемрай забраны край. Прарок у купалаўскім вершы выкарыстоўвае апрабаваныя псіхалагічныя прыёмы, кідае людзям знарок крыўдныя словы: „рабскія натуры”, „вы, як збэшчаныя госці, пракляццем сталі той зямлі”, якія павінны былі б зачапіць і разварушыць абыякавую людскую

[12] *Ibidem*, с. 78.
[13] *Ibidem*, с. 77.
[14] *Ibidem*, с. 106.

масу, але грамада нават не заўважае гэтай крыўды. „Пасол святла" прыносіць вестку пра духоўнае абнаўленне, а засяроджаная на зямных клопатах грамада не ў стане адчуць абуджальную моц яго слоў. На доўгую пафасную прамову прарока, звернутую да душаў людзей, тыя коратка адказваюць на падкрэслена матэрыяльным узроўні: „А колькі нам дасі чырвонцаў…"[15]. Як адзначае У.М. Конан,

> „у больш шырокім сэнсе верш – усведамленне паэтам трагедыі чалавечага духу, скаванага формамі сацыяльнага быцця, і рамантычнае ўяўленне пра трагедыю народа, які страціў свабоду, сваё імя і імкнецца вярнуць сабе іх, але яшчэ не гатовы скінуць ланцугі духоўнага рабства, стаць раўнапраўнай нацыяй сярод іншых народаў"[16].

Прарокі-празарліўцы прадбачаць трагізм уласнага лёсу і сумны вынік сваёй місіі, але іх словы з'яўляюцца для грамады раздражняльнікам, стымулятарам перамен. Апісаны паэтам крайні духоўны заняпад народа, канфрантацыйнае сутыкненне дзвюх пазіцый, безвыніковасць місіі прарока і ўпартае неразуменне грамадой свайго ганебнага стану, павінны выклікаць псіхалагічную фрустрацыю чытача, якая можа з'явіцца пачаткам працэсу ўнутранага абнаўлення, перастаноўкі ў іерархіі каштоўнасцяў і замацаваннем новых прагрэсіўных праграм дзеяння.

Створаную ў вершы сітуацыю ўзаемаадносін прарока і грамады можна экстрапаліраваць на творчасць Янкі Купалы, які, па-сутнасці, выконвае ў нашай нацыянальнай гісторыі функцыю прарока-будзіцеля. Асноўны пафас творчасці Янкі Купалы – заклік да духоўнага адраджэння, без якога немагчыма ні нацыянальнае, ні сацыяльнае вызваленне, і ў выніку – выхад нацыі на якасна новы ўзровень быцця. Паэт адно толькі папярэджвае, каб беларусы не спазніліся на цягнік гісторыі: „Бо што не возьмеце сягоння, // Таго і заўтра вам не ўзяць." Правакацыйныя прыёмы як сродак псіхалагічнага ўздзеяння на чытача пакліканы спрыяць як мага больш эфектыўнаму і дзейснаму перайначванню ранейшых сацыяльна-псіхалагічных стэрэатыпаў і каштоўнасных установак і ў выніку фарміраванню духоўна спелай і свядомай асобы.

*Iryna Burdeljova*

**Provocative strategies in Yanka Kupala's poetry**

A b s t r a c t

The article explores the artistic phenomenon of provocativeness in the poetry of Yanka Kupala as a strategy of psychological influence on the reader. The poet used provocative strategies as catalysts of positive processes in Man and society. Provocation served the purpose of changing persistent social, cultural and personality-related stereotypes of the readers and transforming old conventional norms with a view to shaping an active, spiritually mature and nationally conscious personality and, by this, contributing to the renewal of Man and society. Selected fragments of Kupala's poetry are quoted to illustrate the author's most frequently used provocative "devices", such as the reversal of readers' ordinary expectations, introduction of contrast, creation of paradoxical situations, refusal and combining disjoint concepts.

---

[15] *Ibidem*, c. 83.

[16] У.М. К о н а н, *Прарок* [у:] Я. К у п а л а, *Энцыклапедычны даведнік*, Мінск 1986, с. 502.